ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ



№ 6(1019) | АЎТОРАК, 26 сакавіка 2002 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

З РЭСПУБЛІКАНСКАГА СЕМІНАРА

## АД АБІТУРЫЕНТА – ДА СТУДЭНТА

**Час уступных экзаменаў – не за гарамі. Абітурыентаў, іх бацькоў вельмі цікавіць уся інфармацыя, звязаная з кампаніяй па прыёму ў ВНУ ў гэтым годзе. Як да яе рыхтуюцца навучальныя ўстановы, над чым засяродзілі асаблівую ўвагу ў Міністэрстве адукацыі, што новага ўводзіцца ў сёлетнія правілы прыёму? Аб гэтым ішла зацікаўленая размова на рэспубліканскім семінары адказных сакратароў прыёмных камісій дзяржаўных ВНУ. Менавіта г.Гомель сёлета стаў месцам правядзення традыцыйнага семінара, які адкрыўся ў ГДУ імя Ф.Скарыны, затым працягваў сваю работу на базе БелДУТа, Беларускага гандлёва-эканамічнага універсітэта спажывецкай кааперацыі.**

Каля 50 адказных сакратароў прыёмных камісій абмяркоўвалі вынікі мінулагодняй уступнай кампаніі, каб не паўтарыць сёлета дапушчаных раней недахопаў, прадоўжыць удасканаленне ўжо напрацаваных форм работы па якаснаму набору абітурыентаў, укараняць новаўвядзенні ў правілах прыёму ў гэтым годзе. У дзелавой і нефармальнай абстаноўцы праходзіў абмен вопытам работы, знаёмства з гомельскімі ВНУ.

Адкрываючы семінар, рэктар ГДУ прафесар М.В.Селькін падрабязна расказаў гасцям пра універсітэт, гісторыю яго стварэння, шляхі развіцця, аб тым, якія ўмовы тут створаны для раскрыцця навуковага і творчага патэнцыялу выкладчыкаў і студэнтаў.

Першы намеснік міністра адукацыі А.І.Жук акрэсліў перспектывы развіцця вышэйшай адукацыіі ў Рэспубліцы Беларусь, адзначыў, што яна знаходзіцца на парозе якасных перамен. Час дыктуе свае ўмовы, і сёння трэба працаваць з улікам міжнародных стандартаў, адзінства адукацыйнай прасторы, Лісабонскай канвенцыі, якая прадугледжвае неабходнасць увядзення дзвюхступеньчатай падрыхтоўкі спецыялістаў – бакалаўраў і магістраў. Названая канвенцыя забяспечвае ўзаемнае прызнанне дакументаў аб адукацыі, якія выдаюцца ў розных краінах. Для гэтага ў рэспубліцы трэба распрацаваць адпаведныя вучэбныя планы і праграмы. А.І.Жук засяродзіў увагу і на новай сістэме ацэнкі кантролю якасці ведаў. У ВНУ будзе ўводзіцца 10-бальная сістэма, якая ўжо дзейнічае ў сярэдніх школах.

Асаблівую ўвагу ўдзельнікаў семінара намеснік міністра звярнуў на неабходнасць перагляду структуры і аб'ёмаў падрыхтоўкі педагагічных кадраў. Прычына – у дэмаграфічнай "яме", якая, па прагнозах спецыялістаў, утворыцца ў рэспубліцы ў 2007 годзе.



**Выступае першы намеснік міністра адукацыі А.І.Жук.**
**Фота У.Чысціка.**

Менавіта ў той час закончаць сваю вучобу студэнты набору 2002 года, і такі вялікі аб'ём спецыялістаў педагагічнага профілю не будзе магчымасці працаўладкаваць. Аб такой сітуацыі ўжо вялася размова на нарадзе рэктараў ВНУ, і ў Міністэрстве адукацыі чакаюць канкрэтных прапаноў менавіта ад саміх ВНУ па распрацоўцы механізма патрэбы спецыялістаў, каб не рыхтаваць за бюджэтныя грошы будучых беспрацоўных.

Вынікі работы прыёмных камісій ВНУ ў мінулым годзе, кантролю за правядзеннем прыёму і аб задачах па якаснаму набору студэнтаў у бягучым годзе, асаблівасці арганізацыі мэтавага набору спецыялістаў асвятліў на семінары намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Мінадукацыі В.Л.Цыбоўскі. Ён, у прыватнасці, адзначыў, што ў мінулым годзе не быў да канца адпрацаваны механізм прыёму і падачы дакументаў абітурыентамі адразу ў некалькі ВНУ, таму здараліся спрэчныя моманты. Сёлета іх трэба пазбегнуць. Былі таксама недапрацоўкі ў прыёме абітурыентаў на мэтавыя месцы. І наогул, як адзначалася, за апошнія 5 год гэты набор неапраўдана вырас і ўжо назіраецца перанасычэнне рынку працы, асабліва выпускнікамі эканамічнага і юрыдычнага профіляў. Да таго ж, як паказвае практыка, узровень ведаў у мэтавікоў ніжэйшы, чым у астатніх абітурыентаў, бо першыя паступаюць на вучобу пры менш жорсткай конкурснай барацьбе. Таму стаіць неабходнасць карэкціроўкі планаў мэтавага набору. У якасці прыярытэтных акрэслены задачы забеспячэння грамадзянам роўных магчымасцей пры паступленні ў ВНУ, работа прыёмных камісій на прынцыпах адкрытасці і галоснасці.

Дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў А.М.Малярэвіч расказаў аб выніках правядзення цэнтралізаванага тэсціравання ў 2001 г. і перспектывах развіцця сістэмы кантролю якасці ведаў абітурыентаў. Ішла размова аб механізме правядзення цэнтралізаванага тэсціравання, якое праводзіцца ў 11 ВНУ рэспублікі, атрымання яго сертыфікатаў. Адзначалася, што сёлета распрацаваны і айчынныя тэсты па беларускай мове і хіміі (раней яны па ўсіх пяці прадметах былі расійскага ўзору).

Удзельнікі семінара азнаёміліся таксама з БелДУТам, вопытам работы яго прыёмнай камісіі. У Беларускім гандлёва-эканамічным універсітэце спажывецкай кааперацыі за "круглым сталом" абмеркаваны асаблівасці Правілаў прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы на сёлетні год і Палажэнне аб прыёмнай камісіі ВНУ, залічэння студэнтаў ва ўмовах раздзельнага конкурсу і дзейнасць прыёмнай камісіі ў час эксперыменту па паралельнаму паступленню абітурыентаў у некалькі ВНУ, ішла размова аб арганізацыі работы па правядзенню пісьмовага экзамена па мове і літаратуры, эсперыменту па 10-бальнай сістэме ацэнкі ведаў абітурыентаў, выкарыстанні камп'ютэрнай тэхнікі ў арганізацыі прыёму і інш.

Удзельнікам семінара была прапанавана шырокая культурная праграма. У ГДУ яны азнаёміліся з навуковай вучэбна-метадычнай выстаўкай выкладчыкаў і студэнтаў, іх творчымі работамі, у БелДУТе наведалі яго музей, азнаёміліся з дварцова-паркавым ансамблем нашага горада, зрабілі экскурсію ў Веткаўскі музей народнай творчасці.

**Т.ДУБЯК.**

## НАРАДА ІДЭАЛАГІЧНАГА АКТЫВУ

У нашым універсітэце праведзена рабочая нарада загадчыкаў кафедр і выкладчыкаў грамадскіх дысцыплін, актыву пярвічнай арганізацыі таварыства "Веды".

Па асноўных пытаннях парадку дня выступіў прарэктар па вучэбнай рабоце, старшыня праўлення абласной арганізацыі таварыства "Веды" прафесар С.Ф.Каморнікаў. Ён падвёў вынікі рэспубліканскіх конкурсаў па грамадскіх і гуманітарных навуках, прааналізаваў работу пярвічнай арганізацыі таварыства "Веды" ГДУ, праінфармаваў аб праграме курсаў павышэння кваліфікацыі загадчыкаў кафедр сацыяльна-гуманітарных дысцыплін ВНУ г.Гомеля "Сучасная сацыяльна-гуманітарная адукацыя: змест і тэхналогіі".

Была заслухана таксама інфармацыя загадчыцы інфармацыйна-аналітычнай службы Н.А.Капыловай.

У рабоце нарады прыняў удзел і выступіў у абмеркаванні разглядаемых пытанняў намеснік старшыні гарадской арганізацыі таварыства "Веды" М.В.Рыбак.

У ГОНАР СВЯТА ЖАНЧЫН

## *МІЛЫЯ, ЦУДОЎНЫЯ, ТАЛЕНАВІТЫЯ...*

Цёпла і сардэчна віншавалі ў ГДУ жаночую палову універсітэцкага калектыву ў гонар свята 8 Сакавіка. Па хадайніцтву прафкамаў, жансавета кіраўніцтвам ГДУ матэрыяльна заахвочаны за высокія вытворчыя паказчыкі, добрасумленную працу, выдатную вучобу, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці 46 прадстаўніц цудоўнага полу – 26 выкладчыц і супрацоўніц, 20 студэнтак. Іх шчыра віталі ў рэктарацы, выказалі ў іх адрас кранальныя словы ўдзячнасці і павагі. Рэктар прафесар М.В.Селькін асабіста уручыў віноўніцам урачыстасці грашовыя прэміі, кветкі.



**На здымку*: лепшыя студэнткі ГДУ пасля ўзнагароджання ў рэктарацe разам з кіраўніцтвам універсітэта.***

Па ініцыятыве Савета жанчын універсітэта і ў гонар першага вясновага свята ў выставачнай зале універсітэта адбыўся конкурс дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва выкладчыц, супрацоўніц і студэнтак. У час яго адкрыцця прагучалі вершы, прысвечаныя жанчынам у аўтарскім выкананні гомельскай паэтэсы Эмы Усціновіч, студэнтаў. Конкурс яскрава пацвердзіў, якім багатым на таленты з'яўляецца "слабы" пол. З самых разнастайных вырабаў, якія радавалі вока сваёй прыгажосцю, журы конкурсу выдзеліла лепшых. Прафкамы матэрыяльна заахвоцілі пераможцаў. Першае месца сярод студэнтак было аддадзена першакурсніцам адпаведна фізічнага і філалагічнага факультэтаў Вользе Мазговай і Ксеніі Кушнаровай. На другім месцы – студэнткі філфака Кацярына Данілкіна і фізічнага факультэта Кацярына Цуранкова, на трэцім – Людміла Зайцава і Вольга Жаўнова з гр. БА-13 філфака. Усім астатнім удзельніцам конкурсу прафкам студэнтаў выдзеліў бясплатныя білеты ў аблдрамтэатр.

Літаральна зачаравалі наведвальнікаў выставы вязаныя вырабы нам. дэкана юрыдычнага факультэта Ірыны Эсмантовіч. Выкананыя з вялікім густам, фантазіяй, вытанчанасцю, яны нікога не пакінулі раўнадушным. Аўтар таксама матэрыяльна заахвочана.

Свае творчыя здольнасці паказалі ў літаратурным конкурсе будучыя філолагі, журналісты, а таксама прадстаўнікі іншых факультэтаў. Яны прысвяцілі свае паэтычныя і празаічныя радкі самаму дарагому чалавеку ў свеце – матулі. Рэдакцыя універсітэцкай газеты вызначыла лепшыя з іх, апублікавала ў нумары, прысвечаным святу 8 Сакавіка. Матэрыяльна заахвочаны Станіслаў Галкоўскі (3 курс, фізічны факультэт), Кацярына Каратыш (3 курс, філфак) і Ганна Чумакова (1 курс, філфак).

**Т.НІКАЛАЕВА.**

## ДА СЯБРОЎ СТАЛА ЗВЫКЛАЙ ДАРОГА



Мінула 10 гадоў з таго часу, як у французскім г.Клермон-Феране – горадзе-пабраціме нашага абласнога цэнтра – у структуры універсітэта Овернь-1 з'явіўся Інстытут прафесіянізаванага кіравання. Яго ўзначаліў прафесар Морыс Шэневуа. Праз некаторы час гэты апантаны сваёй працай вучоны наведаў Гомель і, у прыватнасці, Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны. Візіт госця заключаўся ў тым, каб на базе ГДУ стварыць Франка-Беларускі інстытут кіравання (ФБІК). Каштоўная ініцыятыва была адобрана і атрымала ўсямерную падтрымку французскага пасольства ў Рэспубліцы Беларусь і Міністэрства адукацыі нашай краіны.

За прайшоўшы час ФБІК стаў па сутнасці філіялам Інстытута прафесіянізаванага кіравання. Вось і нядаўна група студэнтаў 3 і 5 курсаў ГДУ праходзіла тут навучанне па дысцыплінах устаноўленай праграмы і вярнулася на радзіму з глыбокімі ўражаннямі ад вучобы і праведзенага вольнага часу.

У гэтым месяцы г.Клермон-Феран наведала яшчэ адна дэлегацыя ГДУ. Яна была запрошана на святкаванне 10-гадовага юбілею Інстытута прафесіянізаванага кіравання. Гасцямі французскіх сяброў сталі рэктар ГДУ прафесар, член-карэспандэнт Беларускай акадэміі адукацыі, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь М.В.Селькін, садырэктар ФБІКа дацэнт А.У.Гаўрылюк, прэзідэнцкі стыпендыят студэнт 4 курса эканамічнага факультэта Сяргей Каморнікаў і выдатнік вучобы з гэтага ж факультэта Сяргей Ігнаценка. Удзел ва ўрачыстасці прынялі таксама рэктары ВНУ з Украіны, Польшчы, Румыніі, Бельгіі, Італіі і іншых краін. На пленарным пасяджэнні, прысвечаным юбілею, першым

**(Заканчэнне на 2-й стар.)**

# ДА СЯБРОЎ СТАЛА ЗВЫКЛАЙ ДАРОГА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

сярод гасцей слова было прадстаўлена прафесару М.В.Селькіну. Ён расказаў аб выніках плённага супрацоўніцтва ГДУ і Інстытута прафесіянізаванага кіравання, перспектывах яго далейшага развіцця і пашырэння.

У час знаходжання на французскай зямлі М.В.Селькін правёў канструктыўныя перамовы з рэктарамі Кіеўскага эканамічнага універсітэта, Будапешцкага універсітэта, Лодзьскай вышэйшай школы і іншых ВНУ замежжа па пытаннях устанаўлення трывалых кантактаў па абмену вопытам у падрыхтоўцы спецыялістаў і развіцця ўзаемакарысных навуковых сувязей.

**Б.ВАЛОДЗІН.**

* * *

**Глазами очевидцев**

Клермон-Ферран встретил нас холодной по французским меркам погодой, но все это осталось незамеченным в результате теплой и душевной встречи, оказанной нам нашими зарубежными друзьями и коллегами. Следующий день мы посвятили отдыху и прогулкам по тихим и узким французским улочкам, конечно же, заглянули и в наш любимый IUP, где мы провели так много времени, постигая азы науки. Ассоциация студентов организовала для всех молодых иностранных гостей игру в боулинг, желающие могли попробовать свои силы и в бильярде. Руководству делегации была предложена насыщенная программа: посещение недавно открывшегося в Клермоне парка вулканов, концерт джазового оркестра и др.

На торжества в честь юбилея института было приглашено свыше 800 человек! Им была представлена история развития IUP в форме оригинально подобранных фотографий. Студентами института были сняты короткометражные фильмы, посвященные 10-летию вуза.

После всех торжественных речей и выступлений на площади перед дворцом все стали свидетелями восхитительного лазерного шоу и незабываемого праздничного салюта...

**С.ИГНАТЕНКО, С.КАМОРНИКОВ, студенты ФБИУ.**

# НЕ ПЕРАСЫХАЦЬ КРЫНІЦАМ ВЕДАЎ

На чарговым пасяджэнні навукова-метадычнага Савета універсітэта было разгледжана пытанне "Аб рабоце бібліятэкі па забеспячэнню вучэбнага працэсу".



Як зазначыла яе дырэктар В.М.Касцючэнкава, важнейшым у іх дзейнасці з'яўляецца папаўненне бібліятэчнага фонду. Так, на сённяшні дзень ён складае 1.028.124 экземпляры друкаваных дакументаў. Аднак назіраецца тэндэнцыя да зніжэння. За 2001 г. у фонды паступіла 8.645 экземпляраў, што на 4371 экземпляр менш, чым у 2000 годзе.

Выказана занепакоенасць недастатковым фінансаваннем на перыядычныя выданні. Так, у 2001 годзе бібліятэкай выпісвалася 214 найменняў расійскіх і беларускіх перыядычных выданняў, 99 найменняў газет, а ў першым паўгоддзі 2002 года гэтыя паказчыкі склалі адпаведна 127 і 21.

На сённяшні дзень у асноўным забяспечаны вучэбнай літаратурай студэнты біялагічнага, матэматычнага, філалагічнага, фізічнага, гістарычнага факультэтаў. Ніжэй нарматыўнай наяўнасць вучэбнай літаратуры па такіх дысцыплінах, як геаграфія, экалогія, псіхалогія, фізічная культура, эканоміка і замежныя мовы.

Савет рэкамендаваў бібліятэцы працягваць работу па камплектаванню інфармацыйных рэсурсаў новай вучэбнай, вучэбна-метадычнай і навукова-метадычнай літаратурай, а таксама сумесна з дэканамі факультэтаў і загадчыкамі кафедр (асабліва па грамадскіх дысцыплінах) да верасня 2002 года правесці спісанне ўстарэлай літаратуры.

Даручана рэдакцыйна-выдавецкаму аддзелу сумесна з бібліятэкай адпрацаваць механізмы перадачы часткі тыражоў навуковай, навукова-метадычнай літаратуры ў фонды універсітэта.

У мэтах больш якаснага інфармацыйнага забеспячэння студэнтаў рекамендавана інфармацыйна-вылічальнаму цэнтру ГДУ паскорыць работу па стварэнню электроннай бібліятэкі.

Пры абмеркаванні пытання "Вучэбна-метадычнае забеспячэнне вучэбных курсаў на кафедрах рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства і беларускай літаратуры" адзначана, што метадычнае забеспячэнне вучэбнага працэсу на названых кафедрах адпавядае крытэрыям вышэйшай школы. У той жа час указана на неабходнасць аднаўлення і папаўнення фонду вучэбных дапаможнікаў як шляхам набыцця новай вучэбнай літаратуры праз бібліятэку універсітэта, так і праз распрацоўку дапаможнікаў сіламі выкладчыкаў кафедр. Звернута ўвага на недастатковую работу кафедр (а на іх сёння працуе чатыры доктары філалагічных навук) па падрыхтоўцы вучэбных дапаможнікаў з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Акрамя гэтага, рэкамендавана перагледзець змест вучэбнага курса "Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя" з мэтай выдзялення мінімума абавязковых для вывучэння літаратурных твораў. Навукова-метадычны савет універсітэта выказаў занепакоенасць перагружанасцю студэнтаў зместам дадзенага курса; для таго, каб здаць залік (або экзамен) студэнт павінен сёння перачытаць больш за 250 літаратурных крыніц. На кафедры, на жаль, не жадаюць заўважаць тое, што ў студэнта ёсць і іншыя дысцыпліны, і што яму таксама неабходна даць час для адпачынку.

Пры абмеркаванні пытання "Аб рабоце з базавымі школамі" і вынікаў абласных алімпіяд адзначана мэтанакіраваная работа кафедры давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі (загадчык кафедры прафесар І.М.Елісеева) і дэканатаў факультэтаў універсітэта па гэтых накірунках. Рэкамендавана факультэту псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі распрацаваць канцэпцыю развіцця давузаўскай падрыхтоўкі ва універсітэце і актывізаваць работу па адкрыццю ліцэя пры універсітэце.

На пасяджэнні НМС універсітэта разгледжана і адобрана "Палажэнне аб парадку планавання і падрыхтоўкі да выдання вучэбнай і вучэбна-метадычнай літаратуры".

ЗАМЕТКИ С ПЕДПРАКТИКИ

# НЕ БОЙСЯ ШКОЛЫ



**"Тяжело в ученье – легко в бою". Эту истину напрямую можно отнести к студентам-филологам 4-го курса, которые недавно прошли боевое крещение в школах г.Гомеля. Формально наша педпрактика считалась пассивной. Может, для кого-то она и была таковой – не берусь говорить за всех – но только не для студентов нашей подгруппы, добросовестно выполнявших долг молодого учителя в средней школе № 12. Добросовестные студенты – это С.Подсосонный, Е.Пархоменко, Н.Акулова, Е.Макуйлова, Е.Уставщиков и ваша покорная слуга.**

**Хочу сразу отметить, что нам очень повезло с педагогическим коллективом, который возглавляет мудрый руководитель и просто очень хороший человек Александр Дмитриевич Тиханский.**

Первую неделю педпрактики мы "знакомились" со своими будущими учениками, готовились к предстоящим урокам. Учителя-методисты школы оказались, как на подбор, внимательными, чуткими людьми и не убегали от нас, как это бывало с практикантами в других школах. Что тут говорить: перед первыми уроками состояние каждого из нас можно было сравнить с извержением вулкана. Учительская буквально "сотрясалась" от наших "сборов". Это естественное состояние было еще более естественным от того, что многие из нас знали, что идут в основном к "трудным" детям, детям из неблагополучных семей, требующих к себе особого внимания.

Расскажу о своем 6 "В". Пожалуй, из всех студентов-практикантов только мне пришлось работать в таком необычном классе. Дело в том, что к моменту моего прихода в школу половина детей из 6 "В" уехала в санаторий. Осталось 11 мальчиков, из них несколько "хорошистов", а остальные, как говорится, "вечные троечники". Но сразу хочу предупредить: друзья мои, пусть у вас никогда не повернется язык назвать ребенка "тупым" и "вечным троечником". Да еще перед всем классом. Дети – это самые ранимые и восприимчивые существа на свете! Когда я вошла в класс и увидела их улыбчивые мордашки, ясные глаза, я поняла, что должна хоть чуточку помочь им почувствовать себя лучше и умнее. Я сразу сказала, что они у меня самый лучший класс в школе – и мы докажем это всем. Похоже, я настолько поверила в них, что эта вера передалась каждому из них. Судя по их активной работе на уроках, можно сказать, что мои молодые коллеги смогли зажечь в каждом ребенке веру в себя, в свои силы.

Стоять перед классом и чувствовать всем своим существом, что дети ждут… ждут интересного урока, ждут понимания, ждут доброты – это не передать словами.

И как тут не вспомнить наших преподавателей из университета: профессиональных методистов и педагогов. Конечно, когда-то нам тоже было очень скучно и трудно учить педагогику, когда-то мы не понимали, зачем забивать свои гениальные головы методами и приемами. Но, поверьте мне, все это нам пригодилось в школе. (Конечно, нам не пришлось приводить детям цитаты А.Макаренко или Ж.-Ж.Руссо, но нет-нет да и вспомнится в нужный момент, что к детям надо подходить "с положительной гипотезой", нужно помогать им самореализоваться.) Когда видишь перед собой ребенка, увлеченного исключительно борьбой и футболом, возникает спортивный интерес увлечь его литературой, например. И это не пустые слова. У меня в классе был мальчик Сергей Абушенко. Так вот, это юное спортивное дарование на моих уроках литературы буквально срывался с места и взахлеб делился впечатлениями о прочитанном дома рассказе. Достаточно было доброго слова и пятерки, чтобы ребенок почувствовал себя не хуже других.

Не могу не отметить достижение Сергея Подсосонного, которому удалось вернуть в школу "трудного" ученика Диму Иванова. Мальчику просто стало интересно учиться у молодого учителя, и, видимо, Сергей нашел к нему тот "доброжелательный подход", который так необходим для полноценной работы.

Большим подспорьем для многих из нас стали и занятия по методике преподавания русской литературы и русского языка. Огромное спасибо преподавателям Н.П.Капшай и И.И.Кобыщ, которые, действительно, подготовили нас к работе в школе. А когда-то мы думали, что нам не понадобится знать, что такое комментарий, устное словесное рисование, каковы этапы комбинированного урока. Если вы считаете, что придете в школу с учебником и дадите отличный урок, вы глубоко заблуждаетесь. И не потому будет обидно, что зачетный урок оценят на плохую оценку, а просто стыдно будет стоять дубом перед учениками и пересказывать им правило из учебника. Дети уснут на ваших уроках, а вы зададите себе страшный вопрос: "Зачем я здесь?" Детям будет легко и интересно, а вам приятно, если ваш урок пройдет увлекательно, информативно. Все наши студенты старались вносить творческий элемент в каждый урок. У детей 12-ти лет абстрактное мышление еще не сильно развито, но они уже готовы рассуждать на различные "литературные" темы. Так, например, в своем классе я проводила урок по стихотворению Н.Рубцова "Звезда полей". Этот урок был разработан совместно с Н.П.Капшай, и когда-то проигран на студентах в университете. Я переживала: смогут ли мои ребята включиться в непростую беседу о счастье, родине, семье. Урок прошел на "отлично". Мои дети еще раз доказали свою трудоспособность, а Наталья Павловна, специально посетившая урок, осталась довольна, тем более что разработкой заинтересовались учителя школы.

Увлекательно, "под музыку", с применением средств наглядности проводил свои уроки С.Подсосонный, старались разнообразить ход уроков и другие студенты подгруппы.

Месяц в школе пролетел незаметно. А лично мне показалось, что я проработала в школе 30 лет. Особенно остро я это почувствовала, когда пришло время прощаться с моими классами 6 "В" и 6 "Д", у которого я заменяла. Когда ты видишь, как у ребенка набегают на глаза слезы, когда он узнает, что "Татьяна Петровна уходит"; когда ты слышишь: "Мы полюбили вас! Не уходите!"; когда ты читаешь их "прощальные анкеты и письма", где в каждой строчке столько честной привязанности и любви; когда твое сердце разрывается от тоски, – ты понимаешь, что больше не сможешь без детей. Никогда.

**Татьяна ЦЕЛЕХОВИЧ, студентка гр. РБ-43 филфака.**

# ІМЯННЫЯ СТЫПЕНДЫЯТЫ



На падставе рашэння Савета універсітэта ад 28 лютага 2002 г. па выніках зімовай залікова-экзаменацыйнай сесіі 2001-2002 навучальнага года назначаны стыпендыі:

**ПЕРСАНАЛЬНАЯ СТЫПЕНДЫЯ САВЕТА ВНУ ІМЯ БОКУЦЯ В.В**

**СЕРАДЗЕ Андрэю** – студэнту 4 курса фізічнага факультэта спецыяльнасці "Фізіка".

**ПЕРСАНАЛЬНАЯ СТЫПЕНДЫЯ САВЕТА ГДУ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ**

**БАЕВІЧУ Георгію** – студэнту 5 курса фізічнага факультэта.

**МАЛЬЦАВУ Яўгену, ЮЧКО Аляксандру, ГАПЕЕВАЙ Кацярыне** – студэнтам 4 курса фізічнага факультэта.

**ПАЛЕГІНАЙ Наталлі, ЦЕЛЯХОВІЧ Таццяне** – студэнткам 4 курса філалагічнага факультэта.

**ФІРСАВУ Дзмітрыю, АНАНЬЕВАЙ Вользе, ЦІМАШЭНКА Сяргею** – студэнтам 4 курса эканамічнага факультэта.

**БАННІКАВАЙ Зінаідзе** – студэнтцы 3 курса эканамічнага факультэта.

**ЦІТОВУ Алегу, РЫЖЫКУ Іллі, ЧАРНАВУС Жане** – студэнтам 4 курса матэматычнага факультэта.

**КУЗНЯЦОВУ Арцёму, КАВАЛЁВУ Уладзіміру** – студэнтам 5 курса матэматычнага факультэта.

**СУДЗІЛОЎСКАМУ Канстанціну** – студэнту 3 курса матэматычнага факультэта.

**ДЗЕЛІКАТНАЙ Алесі, НАСОН Наталлі, ІГНАЦЬЕВАЙ Ірыне** – студэнткам 4 курса факультэта замежных моў.

**СІЛКОВУ Андрэю** – студэнту 3 курса факультэта псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі.

**ЛУПЕКІНАЙ Алене** – студэнтцы 4 курса факультэта псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі.

**ПАНКРАТАВУ Дзмітрыю, ШВАЙЛІКАВАЙ Святлане, КЛАЧКО НАТАЛЛІ** – студэнтам 5 курса факультэта псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі.

**ВАНСОВІЧ Але, ФЛЁРКА Таццяне, КАРЛІОНАВАЙ Наталлі** – студэнткам 4 курса геолага-геаграфічнага факультэта.

**РАМЕННІКАВАЙ Аляксандры, КАЛАЦЭЙ Вользе, ДЗЕГЦЯРОВУ Канстанціну** – студэнтам 4 курса юрыдычнага факультэта.

**ПЯРЭРВА Ірыне, МІХАЙЛАВУ Дзмітрыю** – студэнтам 5 курса юрыдычнага факультэта.

**РАКАВАЙ Марыне** – студэнтцы 5 курса біялагічнага факультэта.

**БАЧУРА Юліі** – студэнтцы 4 курса біялагічнага факультэта.

**ШАЎЦОВАЙ Людміле, БАРСУКОВАЙ Таццяне** – студэнткам 3 курса біялагічнага факультэта.

**ВАСІЛЬКОВУ Дзмітрыю** – студэнту 3 курса факультэта фізічнай культуры.

**БЫЧКОВУ Аляксандру, ДАВЫДАВУ Андрэю** – студэнтам 4 курса факультэта фізічнай культуры.

**ГЕРАСІМЕНКА Наталлі** – студэнтцы 5 курса факультэта фізічнай культуры.

**ВАРОНЕНКА Аляксандру** – студэнту 4 курса гістарычнага факультэта.

**СУШКО Людміле** – студэнтцы 3 курса гістарычнага факультэта.

# СУСТРЭНУЦЦА СКАРЫНАВЕДЫ

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь зацвердзіла план правядзення 16-17 мая 2002 г. у Гомелі II Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Скарына і наш час". Яе арганізоўваюць наш універсітэт, Таварыства Кірылы Тураўскага і Гомельская спецыялізаваная славянская бібліятэка.

Спонсарам канферэнцыі выступае таварыства з абмежаванай адказнасцю "Сервер" (генеральны дырэктар У.А.Рай). У склад арганізацыйнага камітэта ўваходзяць вядучыя скарынаведы свету, сярод якіх Ю.А.Лабынцаў (дырэктар цэнтра ўкраіназнаўчых і беларусазнаўчых даследаванняў Інстытута славяназнаўства і балканістыкі Расійскай Акадэміі навук, доктар філалагічных навук), Я.Д.Ісаевіч (акадэмік НАН Украіны, ганаровы доктар Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я.Купалы, доктар гістарычных навук, прафесар), А.А.Баршчэўскі (загадчык кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта, габілітаваны доктар), Францішка Сокалава (загадчык аддзела Нацыянальнага культурна-асветнага цэнтра імя Ф.Скарыны пры Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь, доктар філасофскіх навук, прафесар) і інш.

Канферэнцыя прысвячаецца даследаванню творчай спадчыны Ф.Скарыны і яго жыццёвага шляху, развіцця яго традыцый у славянскім мовазнаўстве, літаратуразнаўстве, правазнаўстве, гістарычнай навуцы, асвеце і адукацыі, філасофіі, у гуманістычнай дзейнасці славянскіх краін.

Навуковыя даклады трэба выслаць да 10 красавіка. Мяркуецца выдаць іх масавым тыражом да пачатку канферэнцыі.

**К.УСОВІЧ, загадчык музея-лабараторыі Ф.Скарыны.**

# ГОМЕЛЬСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ ИМ. Ф.СКОРИНЫ ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ СТУДЕНТОВ НА I КУРС ЗАОЧНОГО ОТДЕЛЕНИЯ НА 2002 ГОД

1. В университет принимаются граждане Республики Беларусь и белорусы, проживающие за её пределами, граждане Российской Федерации, Республики Казахстан, Киргизской Республики, Республики Таджикистан, лица, постоянно проживающие на территории республики или имеющие статус беженца.

Указанные категории лиц имеют право получить в университете на базе среднего образования на конкурсной основе бесплатное высшее образование, если образование данного уровня получается впервые.

Граждане других зарубежных стран принимаются в университет на основе межгосударственных соглашений или договоров с оплатой обучения.

2. **Приём заявлений с 13 мая по 14 июня. Вступительные экзамены с 17 июня по 30 июня. Зачисление** в состав студентов: по плану — **до 5 июля,** на условиях оплаты обучения — **до 31 августа.**

3. Поступающие в университет подают в приёмную комиссию или присылают следующие документы (в оригинале):

– заявление установленного образца на имя ректора;

– документ государственного образца о среднем образовании;

– сертификат централизованного тестирования (для тех, кто прошел централизованное тестирование и поступает на нефилологические специальности – по белорусскому (русскому) языку и литературе; на специальность «Автоматизированные системы обработки информации» – по всем испытаниям;

– медицинскую справку по форме 086У;

– заключение врачебно-квалификационных комиссий (для инвалидов I-III групп, а также детей-инвалидов);

– выписку из трудовой книжки (для тех, кто работает);

– справку исполкома сельского Совета, подтверждающую постоянное проживание в сельских населенных пунктах не менее двух лет;

– справки из службы занятости населения (для тех, кто находится на её учёте);

– 6 фотографий размером 3х4.

Одновременно представляются документы, которые подтверждают право абитуриентов на льготы, установленные законодательством Республики Беларусь, или свидетельствуют о личных талантах и способностях абитуриентов.

Абитуриенты, поступающие не в год получения среднего образования, обязаны представить документы, которые подтверждают их работу или учёбу за годы, предшествующие поступлению (диплом, выписку из трудовой книжки, справку из службы занятости населения и др.).

Паспорт или другое свидетельство личности, выданное органами МВД Республики Беларусь, предъявляются в приёмную комиссию абитуриентом лично.

4. Университет осуществляет приём студентов сверх плана приёма на условиях договоров с оплатой обучения юридическими или физическими лицами. На места сверх плана приёма, количество которых определяется приёмной комиссией, на конкурсной основе зачисляются:

– абитуриенты, которые положительно сдали вступительные экзамены, но не прошли по конкурсу в университет на бюджетные места;

– лица, прошедшие обучение на подготовительном отделении университета по итогам совмещённых выпускных и вступительных экзаменов;

– абитуриенты, которые имеют направления предприятий (организаций) и положительно прошли собеседование по предметам вступительных испытаний.

**Собеседование** проводится **с 21 по 22 августа.** Приём заявлений от абитуриентов, поступающих в университет на условиях договоров с оплатой обучения, осуществляется **с 7 по 16 августа.**

5. Все вступительные экзамены, за исключением экзамена по белорусскому или русскому языку и литературе для поступающих на нефилологические специальности, являются конкурсными. Они (кроме экзамена по спецфизподготовке) проводятся по программам, которые составлены в соответствии с учебными программами средней общеобразовательной школы (базовый уровень) и утверждены Министерством образования Республики Беларусь. Экзамены проводятся с оценкой знаний по шестибальной системе (2; 3; 3,5; 4; 4,5; 5). На специальности «Русская филология» и «Белорусская филология» все экзамены – конкурсные, а на остальные специальности экзамен, указанный в перечне последним – неконкурсный.

| Специальности | Экзамены |
|---|---|
| Русская филология | 1. Русский язык (диктант)<br>2. Русский язык и литература (устно)<br>3. Белорусский язык и литература (устно) |
| Белорусская филология | 1. Белорусский язык (диктант)<br>2. Белорусский язык и литература (устно)<br>3. Русский язык и литература (устно) |
| Математика | 1. Математика (устно)<br>2. Математика (письменно)<br>3. Белорусский (русский) язык и литература (изложение) |
| Бухгалтерский учёт, анализ и аудит<br>Экономика и управление на предприятии | 1. Математика (устно)<br>2. Иностранный язык (устно)<br>3. Белорусский (русский) язык и литература (изложение) |
| Автоматизированные системы обработки информации | 1. Физика (устно)<br>2. Математика (устно)<br>3. Белорусский (русский) язык и литература (изложение) |
| История | 1. История Беларуси (устно)<br>2. Иностранный язык (устно)<br>3. Белорусский (русский) язык и литература (изложение) |
| Правоведение | 1. Математика (устно)<br>2. Человек и общество (устно)<br>3. Иностранный язык (устно)<br>4. Белорусский (русский) язык и литература (изложение) |
| География | 1. География (устно)<br>2. Математика (устно)<br>3. Белорусский (русский) язык и литература (изложение) |
| Биология | 1. Биология (устно)<br>2. Химия (устно)<br>3. Белорусский (русский) язык и литература (изложение) |
| Физическая культура и спорт | 1.Экзамен по спецфизподготовке<br>2. Биология (устно)<br>3. Белорусский (русский) язык и литература (изложение) |

6. Для всех абитуриентов обязательным является письменный вступительный экзамен по белорусскому или русскому языку.

Экзамен по иностранному языку абитуриенты могут сдавать на выбор, независимо от того, какой иностранный язык они изучали в среднем учебном заведении.

7. Абитуриенты, которые не явились на экзамен без уважительных причин или получили неудовлетворительную оценку («2» по шестибалльной системе), а также которые забрали документы, к дальнейшим экзаменам не допускаются.

8. Апелляции по вопросам экзаменационных оценок подаются ответственному секретарю приёмной комиссии на имя ректора в день проведения устного экзамена или в день объявления оценки по письменному экзамену. Повторная сдача экзамена не разрешается.

9. Зачисление в университет проводится по конкурсу. В первую очередь зачисляются абитуриенты, имеющие среднее специальное или профессионально-техническое образование, или работают не менее шести месяцев и поступают на соответствующие или родственные специальности. Конкурс проводится по специальностям.

Другие лица, имеющие одинаковый или высший балл, зачисляются в пределах 20% от контрольных цифр приёма по данной специальности, а также на вакантные места после зачисления вышеперечисленных категорий лиц.

При приёме на специальности "Автоматизированные системы обработки информации" засчитываются результаты централизованного тестирования в соответствии с представленным государственным сертификатом по всем испытаниям, на нефилологические специальности – по белорусскому (русскому) языку и литературе.

10. **Совмещенные выпускные и вступительные экзамены для слушателей подготовительного отделения университета – с 17 по 30 июня**. С результатами совмещенных экзаменов они могут участвовать в общем конкурсе и в конкурсе на места сверх плана приема на условиях договоров с оплатой обучения юридическими и физическими лицами.

Лица, которые прошли обучение через другие формы довузовской подготовки при университете, зачисляются на общих основаниях.

11. Лица, закончившие среднее общеобразовательное учебное заведение с медалью, среднее специальное учебное заведение или ПТУ (на основе базовой школы с получением среднего образования) с дипломом с отличием, сдают все вступительные экзамены и участвуют в общем конкурсе.

12. Вне конкурса при получении положительных оценок на вступительных экзаменах зачисляются:

– воины-интернационалисты;

– дети-сироты и дети, оставшиеся без опеки родителей;

– дети из семей военнослужащих или рабочих и служащих, которые занимали штатные должности в воинских частях, погибших (умерших) или ставших инвалидами во время прохождения воинской службы или работы в составе советских войск на территории государств, где велись боевые действия, а также дети из семей военнослужащих, погибших (умерших) в мирное время при прохождении воинской службы;

– дети из семей лиц начальственного и рядового состава органов внутренних дел, погибших (умерших) или ставших инвалидами при исполнении служебных обязанностей на территории государств, где велись боевые действия, а также погибших (умерших) в мирное время при исполнении служебных обязанностей;

– дети из семей лиц начальственного и рядового состава органов финансовых расследований Республики Беларусь, погибших (умерших) при исполнении служебных обязанностей;

– инвалиды I и II групп, а также дети-инвалиды, которым в соответствии с заключением медико-реабилитационных экспертных комиссий не противопоказано обучение в вузе и которые могут посещать занятия;

– лица, которые имеют льготы в соответствии со ст.18 Закона Республики Беларусь "О социальной защите граждан, потерпевших от катастрофы на Чернобыльской АЭС". Абитуриенты этой категории, которые закончили учебные заведения с отличием (с отличными оценками) зачисляются по результатам собеседования по предметам вступительных экзаменов. **Собеседование** проводится **12 июня;**

– белорусы зарубежья по рекомендациям белорусских организаций или учебных заведений зарубежья на специально выделенные органами управления учебными заведениями места, в рамках контрольных цифр приема.

13. При равенстве конкурсных баллов преимущество имеют:

– инвалиды III группы при отсутствии медицинских противопоказаний;

– лица, которые имеют льготы в соответствии со ст.ст.19, 20, 23, 24, 25 Закона Республики Беларусь "О социальной защите граждан, потерпевших от катастрофы на Чернобыльской АЭС";

– уволенные в запас военнослужащие, имеющие льготы, установленные законодательством, и рекомендации воинских частей;

– лица, имеющие стаж работы не менее двух лет;

– медалисты средних общеобразовательных учебных заведений, отличники средних специальных учебных заведений и ПТУ на основе базовой школы, а также отличники ПТУ на основе средней школы при поступлении на специальности, соответствующие полученным профессиям;

– выпускники 2002 года подготовительного отделения университета при поступлении на соответствующие специальности;

– профессионально ориентированные абитуриенты (закончили факультет довузовской подготовки и профориентации по профилю избранной специальности, имеют стаж работы по специальности, соответствующей избранной, или другую профессиональную ориентацию).

14. Для получения второго высшего образования принимаются лица на условиях полной оплаты обучения. Порядок зачисления этих лиц определяется соответствующим положением.

15. Университет осуществляет приём выпускников Речицкого педагогического колледжа на сокращённый срок обучения по специальности «Белорусский язык и литература» на условиях, определенных учебно-научным объединением согласно действующих нормативно-правовых документов.

16. Все другие вопросы, связанные с приёмом, окончательно решаются приёмной комиссией университета на основе законодательства Республики Беларусь и "Правил приёма в высшие учебные заведения Республики Беларусь на 2002 год".

17. Документы направлять по адресу: **246019, г.Гомель, ул. Советская, 104, Гомельский госуниверситет им. Ф.Скорины, приёмная комиссия. Телефоны: 56-73-38 (приёмная комиссия), 57-69-17 (ответственный секретарь).**

ПРИЁМНАЯ КОМИССИЯ.

Времена года

# ВЕСНЫ БЛАГОДАТНОЙ ПОРА



Весна! Само слово это означает собственно светлое, ясное, теплое время года. Некоторые ученые не без основания полагают, что слово "весна" неким образом связано со словом "веселый": выражение "настали для него светлые, ясные дни" равнозначно "дням радости, веселья", что в полной мере ощущается именно весной, после холодов и долгой зимней спячки.

Первому месяцу весны древние белорусы дали имя ***сакавік***, потому что сок начинает течь в теле деревьев. Украинцы величали начало весны ***березнем***, а в русском варианте и по сей день удерживается латинская форма ***март***. Согласно легенде, martius "провозгласили" Ромул и Рем в честь бога солнца и войны Марса, по совместительству бывшего еще и опекуном земледелия и животноводства и олицетворявшего также творческие силы природы.

В марте зримо прибывающий день и весеннее солнце пробуждают спящую, безмолвную природу и радуют весь мир: снег чернеет и тает; к 17 марта лед на реках становится настолько слабым, что щука его пробивает хвостом; на севере Беларуси клен уже в середине марта, говорят, заливается собственным соком, а береза – в конце; появляются "котики" на вербе, выглядывают "пралескі" из-под сухих прошлогодних листьев вперемежку с зеленеющей травой; начинаются рыбьи свадьбы, оживляется птичье присутствие.

Все народные, языческие ("языки" изначально – "народы") праздники связаны с реальной жизнью – жизнью всего живого, всей замкнутой системы – Вселенной. В условиях Земли реальная жизнь зависит от природных условий, и прежде всего от погоды. Наши предки наблюдали за природой не из праздного любопытства – от нее полностью зависела их жизнь. Они видели, что в марте солнце начинает "марить" (припекать землю), поэтому над землею струится пар, но по утрам еще продолжаются морозы (утренники), которых со дня Сороков (Саракі, Саракасвятыя, Сорак мучанікаў) бывает сорок.

В глубокой древности, в дохристианские времена этот языческий праздник был, вероятно, связан с весенним равноденствием (20-21 марта), с которого окончательно начиналась весна. Отцы церкви не смогли справиться с представлениями наших предков и поэтому поверх естественной религии славян нанесли свою лепнину – так появились сорок мучеников там, где им делать нечего. В этот день, согласно народным приметам, сорока начинает вить гнездо и кладет в него 40 прутиков, а из вирия возвращаются 40 разных пташек, среди которых – особо почитаемые славянами ласточки и жаворонки. (Кстати, если кто-нибудь увидит в этот день летящий "вырай", то, по народному поверью, его ждет успех и счастье во всем!). В честь "птичек божьих, что не знают ни заботы, ни труда", славяне, "помнящие родство свое", выпекают из теста сорок съедобных жаворонков (в некоторых областях – 40 вареников, 40 маленьких пирожков или галушек), обмазывают их медом, золотят им крылья и головы сусальным золотом, а потом с такими самодельными птичками ходят по селу и во весь голос закликают Весну:

*Жавороночки, прилетите,*
*Студену Зиму унесите,*
*Теплу Весну принесите!*

В принципе всех птиц, прилетающих из вирия (райских стран) наши добрые предки всегда встречали как вестников благодатной весны, считая, что они отпирают облака, которые замкнула на зиму Стужа, и тогда на землю проливается живительный дождь, дарующий ей силу и плодородие.

Призывание Весны – очень трогательный обряд: в марте и апреле дети и девушки взбирались на кровли амбаров, поднимались на ближайшие холмы и пригорки и оттуда зазывали Весну, обращаясь к ней, как к существу живому, благодатному, творческому:

*Весна, Весна красная!*
*Приди, Весна, с радостью,*
*С радостью, с радостью,*
*С великой милостью.*
*Со льном высоким,*
*С корнем глубоким,*
*С хлебами обильными!*

На Руси Весну встречали круглым хлебом (Солнце!), который клали на расстеленный в поле новый холст. Повернувшись на восход солнца, говорили: "Вот тебе, матушка Весна!" и, оставив приношения под открытым небом, возвращались домой, уверенные, что Весна "оденется в новину" и за принесенные ей дары поспособствует хорошему урожаю.

Называли наши предки-славяне весну Лялей. В народном представлении она – юная, красивая и стройная дева ("прыгожая, як ляля", говорят белорусы о девушках).

**Дежурная по рубрике**
**Т.АВДОНИНА, доцент кафедры довузовской подготовки и профориентации .**

## УВАГА! КОНКУРС!

**Савет жанчын універсітэта запрашае ўсіх жадаючых членаў калектыву ГДУ прыняць удзел у выстаўцы кулінарнага майстэрства, якая адбудзецца 8 красавіка г.г. у галоўным корпусе. На яе можна прадстаўляць самыя разнастайныя вырабы: салаты, выпечку, напіткі, усё, на што хопіць фантазіі і сродкаў.**

**Адкрыццё выстаўкі – у 10 гадзін у выставачнай зале, папярэдне свае вырабы прадставіць з 8.30 да 9.30 у музей Ф.Скарыны.**

**Пераможцаў і актыўных удзельнікаў конкурсу чакаюць прызы.**

ВЕРАМЕЙЧЫК ВАСІЛЬ ЯЎСТРАТАВІЧ



Вестка аб тым, што напярэдадні веснавога жаночага свята перастала біцца сэрца гэтага чалавека, вялікім смуткам адгукнулася ў свядомасці яго калег, былых і цяперашніх студэнтаў біялагічнага факультэта, шматлікіх сяброў. Каварная хвароба хутка падарвала здароўе Васіля Яўстратавіча і ён заўчасна пайшоў з жыцця.

Васіль Яўстратавіч Верамейчык нарадзіўся ў шматдзетнай сялянскай сям'і і вырас на ўнікальнай беларускай зямлі – Салігоршчыне. Тут жа пачалася яго працоўная біяграфія. А пасля армейскай службы яго вучоба і ўся астатняя працоўная дзейнасць былі звязаны з нашай ВНУ. Пасля пасляховага заканчэння хіміка-біялагічнага факультэта былога Гомельскага дзяржпедінстытута імя В.П.Чкалава ён пэўны час працаваў загадчыкам лабараторый, затым абагачаў свае прафесійныя веды ў аспірантуры. У ліку першых яе выпускнікоў абараніў дысертацыю на атрыманне вучонай ступені кандыдата сельскагаспадарчых навук.

На родным факультэце Васіль Яўстратавіч прайшоў шлях ад асістэнта да дацэнта, выбіраўся дэканам біяфака. У апошнія гады ён працаваў дацэнтам кафедры батанікі і фізіялогіі раслін. І якую б пасаду не займаў вучоны, яго заўсёды вызначалі самаадданасць, добрасумленнасць, выключная сціпласць.

Адметнасцю ў характары Васіля Яўстратавіча была не толькі патрабавальнасць да сябе, але і да падначаленых. Да кожнага, калега гэта ці студэнт, адносіўся чуйна і паважліва. За гэта і карыстаўся шырокім аўтарытэтам.

Светлая памяць і найлепшыя ўспаміны аб Васілю Яўстратавічу назаўжды захаваюцца ў нашых сэрцах.

**ГРУПА ТАВАРЫШАЎ.**

ЗА ЗДАРОВЫ ЛАД ЖЫЦЦЯ

# РАБОТУ ТРЭБА ЎЗМАЦНІЦЬ

Адбылася нарада па прафілактыцы ВІЧ-інфекцыі ў нашым універсітэце. Яе правёў першы прарэктар ГДУ А.П.Кармазін. Ён адзначыў важнасць, злабадзённасць праблемы СНІДу, асабліва ў маладзёжным асяроддзі, неабходнасць ўзмацнення барацьбы з гэтым захворваннем.

У ГДУ распрацавана структура кіравання інфармацыйнай работай па прафілактыцы ВІЧ/СНІДу. У адпаведнасці з распараджэннем Міністэрства адукацыі рэспублікі для студэнтаў першых курсаў усіх спецыяльнасцей выкладаецца дысцыпліна "Прафілактыка СНІДу і наркаманіі" ў аб'ёме 14 гадзін. Работнікамі бібліятэкі сістэматычна афармляюцца тэматычныя кніжныя выставы ў чытальных залах і на абанементах. Да Сусветнага дня прафілактыкі СНІДу – 1 снежня на факультэтах, у інтэрнатах праводзяцца разнастайныя культурна-асветніцкія мерапрыемствы па названай тэматыцы.

Аднак гэтага яўна недастаткова. Пастаўлена задача распрацаваць ва універсітэце Комплексную інфармацыйную праграму прафілактыкі ВІЧ-інфекцыі да 2005 года, напоўніць яе канкрэтным зместам, больш поўна выкарыстоўваць патэнцыял культурнага комплексу, прафсаюзных, маладзёжных арганізацый, санаторыя-прафілакторыя, рэдакцыі універсітэцкай газеты, аддзела выхаваўчай работы для барацьбы за здаровы лад жыцця, прадухіленне росту захворвання веку.

Для больш плённай работы ў гэтым накірунку Гомельскаму абласному цэнтру прафілактыкі СНІДу варта таксама аказваць універсітэту неабходную дапамогу ў забеспячэнні наглядными матэрыяламі.

(Наш кар.)

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

– эканамічных тэорый – загадчыка кафедры;

– лёгкай атлетыкі і лыжнага спортаў – дацэнта.

Тэрмін падачы заяў – не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

# ПАДЗЯЛІЛІСЯ ГУМАНІТАРНАЙ ДАПАМОГАЙ

Для ўмацавання здароўя, падтрымкі жыццёвых сіл арганізма пасля зімовага перыяду члены універсітэцкага калектыву атрымалі вітаміны з гуманітарнай дапамогі, дасланай у санаторый-прафілакторый ГДУ з Германіі. Іх значная колькасць дала магчымасць не толькі забяспечыць карыснымі прэпаратамі літаральна кожнага студэнта, выкладчыка і супрацоўніка нашай ВНУ, але і падзяліцца імі з іншымі навучальнымі ўстановамі горада і вобласці. Так, прафілакторыю Мазырскага педагагічнага інстытута імя Н.К.Крупскай перададзена іх 20 скрынак (па 20 тыс. шт. у кожнай), калектывам тэхнічнага універсітэта імя П.О.Сухога і дарожна-будаўнічага тэхнікума – адпаведна 15 і 12.

Спорт

# ЗНОЎ НАШЫ МАЦНЕЙШЫЯ!

У Мінску прайшлі Рэспубліканскія студэнцкія гульні па паўэрліфтынгу (сілавому трохбор'ю), у якіх за ўзнагароды спрэчку вялі 17 каманд ВНУ.

І зноў у агульнакамандным заліку перамаглі студэнты нашага універсітэта.

На вышэйшую прыступку п'едэстала гонару падняліся майстры спорту: чацвёртакурснік факультэта фізічнай культуры Павел Чакмароў (56 кг), які ўстанавіў два рэкорды Беларусі, пяцікурснік гістарычнага факультэта Андрэй Кашыцкі (110 кг) і студэнт факультэта фізічнай культуры Павел Клімкоў (125 кг), які ўстанавіў тры рэкорды Беларусі.

Пяцікурснік факультэта фізічнай культуры Міхаіл Антропаў (56 кг) быў другім. Другія месцы таксама занялі Максім Пятроўскі (52 кг) – студэнт 3 курса эканамічнага факультэта, студэнт факультэта фізічнай культуры Мікалай Жукоўскі (90 кг) і другакурснік гэтага ж факультэта Аляксандр Пабягаеў (100 кг).

Бронзавы медаль заваяваў майстар спорту з факультэта фізічнай культуры Аляксей Марозаў (110 кг).

Да гэтага трэба дадаць, што двухразовы чэмпіён Еўропы, майстар спорту Уладзімір Галавач сказаў, што цяперашнее дасягненне стала магчымым толькі дзякуючы мэтанакіраванай палітыцы ў спорце рэктарата і дэканата факультэта фізічнай культуры.

* * *



У Гомелі завяршыўся занальны Рэспубліканскі турнір па міні-футболу, у якім прынялі ўдзел сем каманд. Зноў добрае майстэрства (трэнер У.І.Джыоеў) прадэманстравалі нашы студэнты. Яны не толькі выйгралі турнір у падгрупе, але і перамаглі ў фінале з лікам 5:1 студэнтаў Беларускага гандлёва-эканамічнага універсітэта. На трэцім месцы – студэнты Беларускага універсітэта транспарту.

**В.МАРЧАНКА.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты біялагічнага факультэта глыбока смуткуюць з выпадку смерці дацэнта кафедры батанікі і фізіялогіі раслін, былога дэкана біяфака **ВЕРАМЕЙЧЫКА Васіля Яўстратавіча** і выказваюць спачуванне яго сям'і і блізкім.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў гістарычнага факультэта, кафедра філасофіі глыбока смуткуюць з выпадку смерці к.г.н., дацэнта **ГАРАНІНА Льва Мікалаевіча** і выказваюць сваё спачуванне яго жонцы дацэнту кафедры філасофіі **ГАРАНІНАЙ Тамары Пятроўне** і блізкім.

Рэктарат, калектыў выкладчыкаў і супрацоўнікаў фізічнага факультэта глыбока смуткуюць з выпадку смерці былога дэкана названага факультэта дацэнта **СТАРЫКАВА Уладзіміра Мікалаевіча** і выказваюць спачуванне яго сям'і і блізкім.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат факультэта псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі, кафедра беларускай літаратуры выказваюць глыбокае спачуванне дэкану названага факультэта, дацэнту кафедры беларускай літаратуры **ЯЦУХНУ Віктару Іванавічу** з выпадку напаткаўшага яго гора – смерці **БАЦЬКІ.**

Калектыў музея-лабараторыі Францыска Скарыны выказвае глыбокае спачуванне супрацоўніцы **ШКРЭДАВАЙ Валянціне Іванаўне** з выпадку напаткаўшага яе гора – смерці **БАЦЬКІ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК — Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 2-14. Тэл. 56-30-71. E-mail: rggu@gsu.unibel.by

Зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263.

Спонсар газеты — прафкам студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на Республиканском полиграфическом унитарном предприятии "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар Уладзімір БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 144
Падпісана да друку 23.03.2002 г.